ГУК "Лунінецкая раённая цэнтралізаванная
бібліятэчная сістэма"
Аддзел бібліятжчнага маркетынгу

# Юбілейны партрэт 2022

**(Да 100-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Савіцкага,
130-годдзя з дня нараджэння Мікалая Анцукевіча,
75- годдзя з дня нараджэння Івана Панасюка,
90-годдзя з дня нараджэння Льва Коласава)**

Методыка-бібліяграфічнае выданне



г. Лунінец, 2022г

# Міхаіл Савіцкі

(18.02.1922 – 08.11.2010)



Міхаіл Андрэевіч Савіцкі – беларускі жывапісец і педагог, народны мастак СССР. Нарадзіўся 18 лютага 1922 года ў вёсцы Звянячы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і селяніна. Быў малодшым сярод чатырох дзяцей. Бацьку ў вёсцы паважалі як майстра, які сталярыў, цяслярыў, каваў, бандарнічаў, рабіў вупраж для коней і налічнікі на вокны. Маці таксама выдатна ткала і прала. Міхась з ранняга дзяцінства марыў стаць мастаком, напэўна, слаба ўяўляючы, што гэта такое. З жывыпісам будучы мастак знаёміўся па іконах і рэпрадукцыях Кустодзіева “Масленіца” і Сурыкава “Раніца Стралецкай казні”, якія аднекуль прывёз бацька. У пяць гадоў Міхась Савіцкі добра чытаў і вельмі любіў часопіс “Вакол свету”. У школе захапляўся фізікай, матэматыкай і рознымі вынаходніцтвамі. Марыў паступіць у мастацкую ВНУ. У 1940 годзе, пасля заканчэння школы, быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі, з пачатку вайны прымаў удзел у абароне Севастопаля ў складзе 345-й стралковай дывізіі, з 4 ліпеня 1942 года да 29 красавіка 1945 года знаходзіўся ў палоне ў канцлагерах у Дзюсельдорфе, Бухенвальдзе, Мітэльбау-Доры, Дахау. Пасля вызвалення з

лагера працягваў службу ў Савецкай Арміі. У 25-гадовым узросце Савіцкі выбраў прафесію мастака, скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (курс знакамітага Валянціна Волкава), потым паехаў у Маскву — вучыцца ў Маскоўскім мастацкім інстытуце імя В. І. Сурыкава ў Дзмітрыя Мачальскага. Ён выпусціўся з чырвоным дыпломам, а дыпломны жывапісны твор «Песня» (1957) быў адразу набыты ў калекцыю Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Вядомасць і папулярнасць да мастака прыйшлі ў 1960-я гады і былі звязаны з новымі павевамі ў выяўленчым мастацтве. Гэта быў час "хрушчоўскай адлігі" – час, калі мастацтва шукала новы погляд на рэчаіснасць, час стварэння прынцыпаў "суровага стылю" ў савецкім мастацтве, час фарміравання яркіх індывідуальнасцяў. Міхаіл Савіцкі ўвайшоў у мастацтва са сваім разуменнем ролі мастака і творчасці ў грамадстве, са сваёй асабістай пазіцыяй, з адметным, новым поглядам на ваенную тэму. У адрозненне ад мастакоў 1940-1950-х гадоў, якія імкнуліся стварыць гераічны летапіс ваенных гадоў, Міхаіл Савіцкі расказаў пра трагічную з'яву, пра нечалавечыя выпрабаванні, якія выпалі на долю людзей у гады ваеннага ліхалецця. Яго мастацтва заўсёды выклікала непадобную цікавасць, спрэчкі і палеміку, бо ў ім спалучаліся і трагедыя, і мужнасць, і прыгажосць адначасова.

Міхаіл Савіцкі аўтар больш чым 200 тэматычных карцін. Вышэйшым увасабленнем яго творчасці сталі раннія працы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне: "Партызаны", "Забойства сям'і партызана", "Поле", "Плач аб загінуўшых героях", "Бежанцы", "Партызанская Мадонна", "Пакаранне смерцю", "Клятва", цыкл карцін "Лічбы на сэрцы", прысвечаны трагадыі канцэнтрацыйных лагераў і цыкл прац "Чорная быль" пра трагедыю Чарнобыля. У апошнія гады Савіцкі быў глыбока веруючым чалавекам і напісаў цыкл "Запаведзі асалоды" і гістарычныя карціны, прысвечаныя зямному жыццю Хрыста.

Працы Міхаіла Савіцкага знаходзяцца ў зборах Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі, Нацыянальнага мастацкага

музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай мастацкай галерэі ў Сафіі, а таксама ў многіх іншых калекцыях.
За сваё жыццё Міхаіл Савіцкі быў неаднаразова адзначаны ганаровымі званнямі і ўзнагародамі, ордэнамі: заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1970), народны мастак БССР (1972) і СССР (1978), першы сярод дзеячаў культуры Герой Беларусі (2006), правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР з 1983-га, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1995), Міжнароднай славянскай акадэміі (1996), Міжнароднай акадэміі навук (2002), лаўрэат Дзяржаўных прэмій Беларусі (1970, 1980, 1998), СССР (1973), Міжнароднай прэміі Андрэя Першазванага ў намінацыі «За Веру і Вернасць!» (2000), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне выяўленчага мастацтва (2002), Міжнароднай прэміі імя М. А. Шолахава (2002), прэміі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў галіне літаратуры і мастацтва (2004), першы кавалер ордэна Францыска Скарыны з 1997 года, ганаровы грамадзянін Мінска з 2001-га.

Памёр Міхаіл Савіцкі 8 лістапада 2010 года. А 7 верасня 2012 года ў Мінску ў адметным будынку Верхняга горада на плошчы Свабоды – былой гарадской сядзібе XYIII стагоддзя, адкрылася Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага. Пастаянная экспазіцыя размешчана ў дзевяці залах. Тут прадстаўлены работы са збораў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Музея гісторыі горада Мінска і сям’і мастака. Дэманструецца інтэр’ер службовага кабінета, які знаходзіўся ў Творчых акадэмічных майстэрнях жывапісу, графікі і скульптуры, створаных па ініцыятыве мастака ў 1981 годзе, а таксама інтэр’ер яго творчай майстэрні па вул.Някрасава.

## Віктарына па творчасці Міхаіла Савіцкага

1. Дзе і калі нарадзіўся мастак Міхаіл Андрэевіч Савіцкі? (18 лютага 1922 года ў вёсцы Звянячы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці)
2. Колькі гадоў было Савіцкаму, калі ён удзельнічаў у баях за Севастопаль? (19 гадоў)

3. У якіх канцлагерах быў Міхаіл Савіцкі ў гады Вялікай Айчыннай вайне?
   (Дзюсельдорф, Бухенвальд, Дахау)
4. Якую мастацкую адукацыю атрымаў М.Савіцкі?
   (Мінскае мастацкае вучылішча і Маскоўскі мастацкі інстытут ім.В.І.Сурыкава)
5. Карціны якой тэматыкі праславілі М.Савіцкага?
   (Ваенная тэматыка)
6. Якая карціна была куплена Дзяржаўнай Трэцякоўскай галерэяй?
   (“Партызанская мадона”, 1967 г.)
7. Што было створана мастаком у 1972 годзе для музея Вялікай Айчыннай выйны ў Мінску?
   (Створан тэмперны роспіс для музея)
8. Чаму прысвечана серыя карцін “Цифры на сердце”, у якую ўвайшлі 16 палотнаў.
   Прысвечана жахам канцлагераў)
9. Якая серыя карцін адзначана Залатым медалём Акадэміі мастацтваў БССР?
   (Серыя карцін “Чёрная быль”)
10. У якіх карцінах М.Савіцкі адлюстраваў падзеі постчарнобыльскага жыцця людзей, цяжкі шлях пераадолення катастрофы?
    («Эвакуация», «Зрячий», «Крест надежды», «Покинутые» и др.)
11. Якія карціны мастак прысвяціў тэме гісторыі станаўлення беларускай нацыянальнай культуры?
    (“Сейбиты» (1972), цыкл карцін для музея Янкі Купалы ў Мінску і інш.)
12. Назавіце партрэтныя работы мастака?
    «Женский портрет» (1966), «Янка Купала» (1979), «Пушкин и Гончаров» (1986)
13. Які ордэн быў уручаны Міхаілу Савіцкаму?
    (Першы кавалер ордэна Ф.Скарыны, 1997 г.)

14. На якую тэматыку ствараў карціны ў апошні перыяд сваёй творчасці М.Савіцкі?
    (Цыкл «Запаведзі асалоды” і гістарычныя карціны, прысвечаныя жыццю Хрыста)
15. Калі была адкрыта Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага?
    (7 верасня 2012 года)

# Мікалай Анцукевіч

(17.02. 1892 – 21.12. 1971)



Мікалай Пятровіч Анцукевіч – педагог, гісторык, лінгвіст, перакладчык. Сваёй самаадданай працай ён пакінуў дабратворны след у Лунінцы, дзе ў 1926 годзе зрабіў пераклад “Слова пра паход Ігараў” на сучасную рускую мову. Нарадзіўся ў мястэчку Ельск Мазырскага павета Мінскай губерні. Скончыў тут пачатковую школу, потым Мазырскую прагімназію, Бабруйскую гімназію з залатым медалём. Па жаданні бацькі паступіў у Пецярбург, у Ваенна-медыцынскую акадэмію, але – “лірык” перамог “хіміка”. Юнак выбраў прэстыжны Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут. На жаль, цяжка захварэў, таму атэстат аб яго заканчэнні «Мікалай Пятровіч Анцукевіч, сын селяніна, 27 год ад роду, веравызнання праваслаўнага» атрымаў толькі ў лютым 1919-га. За кандыдацкае “сачыненне” “Гісторыя Турава-Пінскага княства” яму прысвоілі навуковую ступень.

Мікалай Пятровіч звыш 30 год аддаў педагогіцы (адначасова збіраў фальклор і вёў культурна-асветніцкую дзейнасць).

У 1920-1927гг. працаваў настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў Лунінецкай прыватнай рускай гімназіі, дзе карыстаўся аўтарытэтам. Калі ў кастрычніку 1921-га Лунінец наведаў Прэзідэнт Міністраў (так тады называлі прэм'ер-міністра Польшчы) Антоній Панікоўскі, яго вітаў Анцукевіч ад імя калектыву "рэалкі". На жаль, шэраг сумных падзей прывялі да яе закрыцця. Пасля Мікалай Пятровіч працаваў у Стаўбцах, адкуль яго запрасілі ў Віленскую беларускую гімназію выкладчыкам латыні і адначасова – інспектарам па выхаваўчай рабоце. У 1936-м М.П. Анцукевіч стаў дырэктарам установы. Але за адстойванне права навучаць дзяцей на беларускай мове ў 1938-м Мікалая Пятровіча перавялі ў горад Ломжа. У пачатку Другой сусветнай вайны ён быў арыштаваны польскімі ўладамі разам з іншымі заложнікамі беларускага насельніцтва Віленшчыны. Вайна не толькі спыніла працу над "Словам…", але і канчаткова парушыла адладжанае жыццё сям'і. Па абвінавачванні ў знявазе нямецкай культуры акупацыйныя ўлады звольнілі Мікалая Пятровіча. Толькі па шчаслівай выпадковасці ён пазбег арышту і канцлагера. У 1945-м працаваў у Віленскім педінстытуце, а праз некаторы час – на кафедры рускай мовы ў Віленскім універсітэце. У 1950-я сышоў на пенсію.

Лунінец стаў для Мікалая Анцукевіча не толькі месцам працы. У 1922-м ён ажаніўся з дачкой дыякана мясцовай Свята-Крыжаўзвіжанскай царквы, настаўніцай рускай мовы і літаратуры Вольгай Васільеўнай Казюліч. У Лунінцы нарадзіліся двое іх сыноў. Уражэнец Лунінца Алег Мікалаевіч Анцукевіч з маленства пражываў у Вільнюсе. Працаваў у Міністэрстве лясной гаспадаркі, меў ступень доктара сацыяльных навук. У 1992 годзе намаганнямі А.М. Анцукевіча манаграфія "Слово о полку Игореве" выйшла ў свет у Вільнюсе, а ў Беларусі, у Мінску, у 2002-м выдадзены зроблены Мікалаем Пятровічам пераклад «Адысеі» Гамера на рускую мову са старажытнагрэчаскім-рускім слоўнікам па гэтым творы.

## Пра жыццё і творчасць М. П. Анцукевіча

1. Анцукевич Н. П. Слово о полку Игореве : [перевод. комментарий. исследование : концепция палеограф., филолог. и ист. толкования памятника] / Н. П. Анцукевич ; отв. ред. и авт. послесл. Н.К. Митропольская.- Изд.: Рус. культ. центр. - Вильнюс : [Пакарскас], 1992. - 284 с.
2. Булахаў, М. Невядомы пераклад “Слова…” / М. Булахаў // Літаратура і мастацтва ”. 1991. 22 сакавіка. (№ 12).
3. Петров, Н. Слово об иследователе “Слова о полку Игореве”/ Николай Петров // Эхо Литвы. 1995. 19 января. (№ 13).
4. Анцукевич, О. Н. Отличительные особенности труда Н.П. Анцукевича “Слово о полку Игореве” / Олег Анцукевич // Лунінецкая памяць. Дадатак 2. / укл. Т. Канапацкая .- Мн.: В. Хурсік, 2007. С. 173-178.
5. Анцукевіч, О. Н. Лунинчанка вдохновляла на творчество / Олег Анцукевич // Лунінецкая памяць. Дадатак 2. / укл. Т. Канапацкая .- Мінск: В. Хурсік, 2007.- С. 164-168.
6. Канапацкая, Т. Мікалай Анцукевіч. Духоўная ахвяра радзіме / Таццяна Канапацкая // Медиа – Полесье. 2016. 16 февраля.

# Іван Панасюк

(нар. 25.04.1947)



Панасюк Іван Аляксеевіч нарадзіўся 25 красавіка 1947 года на хутары “Лыпкы” вёскі Астрамечава Брэсцкага раёна.

З 1 верасня 1954 года па 28 чэрвеня 1965 года вучыўся ў Астрамечаўскай сярэдняй школе, дзе скончыў 11 класаў. З 25 жніўня 1965 года па 18 верасня 1966 года працаваў настаўнікам фізічнай культуры і чарчэння ў Вялуцкай васьмігадовай школе Лунінецкага раёна. З 20 верасня 1966 года служыў у ВМФ СССР. У 1967/68 навучальным годзе працаваў настаўнікам працоўнага навучання і чарчэння Бродніцкай васьмігадовай школы, быў класным кіраўніком 8-га класа. З 1-га верасня 1968 года вярнуўся ў Вялуцкую васьмігадовую школу, дзе да 1972 года працаваў настаўнікам фізічнай культуры і чарчэння, з 1972 года быў назначаны ваенным кіраўнікам (у будучым настаўнікам пачатковай ваеннай падрыхтоўкі) і настаўнікам нямецкай мовы ўжо Вялуцкай сярэдняй школы. 23 жніўня 1973 года ажаніўся. Жонка, Ларыса Канстанцінаўна — настаўніца геагафіі і біялогіі. У студзені 1976 года нарадзілася дачка Марынка, якой 2 чэрвеня 1995 года раптоўна не стала…

Працуючы ў Вялуцкай СШ, акрамя ўрокаў быў заняты пазакласнай і гуртковай работай. У вучняў 8–11класаў з’яўляўся кіраўніком групы ”Пошук”, з членамі якой здзейснілі не адзін паход па месцах баявой славы партызанскіх атрадаў і атрадаў асобага прызначэння на тэрыторыях Лунінецкага, Ганцавіцкага і Салігорскага раёнаў. З членамі групы “Пошук” і вучнямі старэйшых класаў здзейснілі паездкі ў гарады-героі: Севастопаль, Мінск, Брэсцкую крэпасць-герой, а таксама ў гарады Ялту і Сімферопаль у 1977 і 1978 гадах. Запамінальныя паездкі ў горад-герой Маскву адбыліся ў 1980 і 1981 гадах, дзе 9 Мая сустракаліся з ветэранамі атрада асобага прызначэння “Барацьбіты” і камандзірам гэтага атрада Дзмітрыем Паўлавічам Распопавым, больш чым 30 лістоў ад якога берагу па сённяшні дзень. Іх змест стаў вядомы ў 2014 годзе, калі зборнік “Письма командиров” з’явіўся напярэдадні 70-годдзя вызвалення нашай Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ён рэкамендаваны не толькі навучэнцам, але і настаўнікам гісторыі,

класным кіраўнікам, кіраўнікам і арганізатарам пазакласнай работы і факультатываў, асабліва тым, хто працуе з праграмай “Лунінеччыназнаўства”.

Група “Пошук” у час прабывання ў Маскве здзейсніла ў тыя далёкія 80-ы гады шмат экскурсій па Маскве за 4 дні. Вучні пабывалі на ўсіх алімпійскіх аб’ектах XX маскоўскай Алімпіяды. У гэтым жа годзе ў Вялуцкай СШ быў адкрыты пакой баявой славы, прысвечаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны в. Велута і ветэранам атрада “Барацьбіты” (ОМСБОН). З 1981 па 1992 год працаваў настаўнікам нямецкай мовы і выхавальнікам 5–8 класаў у Лунінецкай школе-інтэрнаце. Праводзіў заняткі кіна-фота гуртка, кіраваўработай групы чырвоных следапытаў “Памяць”. У 1984 годзе завочна закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моваў.

З 1992 па 2007 год працаваў настаўнікам нямецкай мовы і кіраўніком фотагуртка ў сярэдняй школе № 2 г. Лунінца. З групай “Юныя сябры прыроды” бывалі часта на прыродзе, займаліся прыродаахоўнымі мерапрыемствамі ў лесе і на берагах некаторых вадаёмаў.

На працягу апошніх 35 гадоў супрацоўнічае з раённай газетай “Лунінецкія навіны”, дасылае матэрыялы краязнаўчага характару і ў другія выданні. Збірае матэрыялы аб прыродзе роднага палескага краю, нашай непаўторнай Лунінеччыны. Больш за 40 год займаецца фатаграфаваннем.

Усе гады існавання грамадскай арганізацыі птушак “Ахова птушак Бацькаўшчыны” з’яўляецца яе пастаянным членам.

**На сённяшні дзень мае наступныя выдадзеныя брашуры і кнігі:** “Прырода і ахоўваемыя тэрыторыі Лунінецкага раёна” (1999, 2000, 2001 гады), „Kreis und Stadt Luninez” (2001), “Велута” (2006),“Палессе маё Лунінецкае” (2007), “Остромечево и остромычивци” (2010). Падрыхтаваны да друку другі зборнік : “От Остромечино до Остромечево” (2011). У лістападзе 2012 года ў Лунінцы надрукаваны зборнік “Інтэрнат ты наш, інтэрнатушка...”. Закончыў карысную брашуру-дадатак да зборніка “Велута” — “Урочышчы і мясціны,

блізкія і далёкія, вакол в. Валута", якая надрукавана ў Пінскай друкарні (31 жніўня 2012 года). У Брэсцкай друкарні ў снежні 2013 года выдадзены зборнік "Навасёлкі лунінецкія". У стадыі заканчэння першая частка "трылогіі": "Дзяцінства з 4 да 7", другая частка будзе "Юнацтва — школьныя гады ад 7 да 18", трэцяя — "І ўсё астатняе жыццё…". Зборнік, які чакаў сваёй чаргі больш 3 гадоў. Першая частка зборніка - гэта работа аўтара з вучнямі Вялуцкай школы на працягу 12 гадоў (1969–1981) і 10 гадоў з выхаванцамі Лунінецкай школы-інтэрната (1981–1992). У 2014 годзе ў Брэсцкай друкарні выйшаў зборнік "Письма командиров". У кнізе прадстаўлены матэрыялы пра атрад спецыяльнага прызначэння "Барацьбіты" і пра партызанскі рух на Лунінеччыне ў 1941-1945гг., а таксама аналізуецца краязнаўчая работа ў Лунінецкім раёне.

## Публікацыі ў перыядычных выданнях

1.Панасюк, И. И дорог нам кубрик матросский! / Иван Панасюк/ Информ-прогулка. 2021. 22 июля. С.4.
2.Панасюк, И. Будничные парадоксы жизни… / Иван Панасюк// Информ-прогулка. 2020. 6 февраля. С.6.
3.Панасюк, И. Земляк-герой / Иван Панасюк / Информ-прогулка. 2020. 5 марта. С.11.
4.Панасюк, І. "Нараджэнне" Лунінца: дакладная дата / Іван Панасюк // Информ-прогулка. 2019. 11 июля. С.3.
5.Панасюк, И. Нас мала, але мы ў цяльняшках…/ Иван Панасюк // Информ-прогулка. 2020. 23 июля. С.8
6.Панасюк, І. Які прыгожы гэты свет, паглядзі наўкол!" / Іван Панасюк; Ларыса Панасюк // Информ-прогулка. 2019. 17 октября. С.4
7.Ляцяць пералётныя птушкі / Іван Панасюк // Информ-прогулка. 2019. 11 апреля. С.4
8.Панасюк, І. Птушкі Лунінца і наваколляў, якіх можна ўбачыць на працягу года / Іван Панасюк / Информ-прогулка. 2019. 7 ноября. С.12.

9. Панасюк, І. Гэта было нядаўна, гэта было даўно… 50 гадоў таму! / Іван Панасюк // Информ-прогулка. 2018. 8 февраля. С.6.
10.Панасюк, І. Марская загартоўка Лунінчан / Іван Панасюк // Лунінецкія навіны. 2018. 27 ліпеня. С.8.
11.Панасюк, И. Фронтовая спутница боевых недель…/ Иван Панасюк // Информ-прогулка. 2017. 11 мая. С.25
12. Панасюк, І. Сувязіст з перадавой / Іван Панасюк // Лунінецкія навіны. 2013. 8 мая. С.3
13. Панасюк, І. Сустрэча сяброў птушак / Іван Панасюк // Лунінецкія навіны. 2012. 18 студзеня. С.2
14. Панасюк, І. Раскажыце нам пра “Край” / Іван Панасюк // Заря. 2010. 7 августа. С.8
15. Панасюк, І. У кожным жыцці свае званы / Іван Панасюк // Настаўніцкая газета. 2010. 2 кастрычніка. С.13
16. Панасюк, І. Легенда пра Велуту / Іван Панасюк // Краязнаўчая газета. 2007. №11. С.4

**Аб жыцці і творчасці І.А.Панасюка**

1.Жылко, В. Генералы і адміралы Лунінеччыны / Вадзім Жылко// Краязнаўчая газета. 2018. №30. С.30
2.Жылко, В. Маё жыццё  Астрамечава маё / Вадзім Жылко // Краязнаўчая газета. 2019. №10. С.4
3. Канапацкая, Т. Новая кніга настаўніка і краязнаўца / Таццяна Канапацкая // Лунінецкія навіны. 2018. 3 жніўня. С.9
4. Жылко, В. Чарговы краязнаўчы год…/ Вадзім Жылко // Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны-3 / уклад. В.В. Жылко. – Лунінец, 2020. С.5-11
5. Жылко, В. Лунінецкая краязнаўчая плынь у 2009-2017 гадах / Вадзім Жылко // Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны / уклад. В.В. Жылко. – Лунінец, 2017. – С.6-18
6. Жилко, В. Самиздат на Лунинетчине / Вадим Жилко, Василий Тумилович // На научных форума: сборник докладов / сост. В.В. Жилко. – Лунинец, 2016. С.11-18. – (Альманах “Лунинецкая муза”; № 35)

# Леў Коласаў

(20.06.1932 – 24.04.2021)



Леў Леанідавіч Коласаў нарадзіўся 20 чэрвеня 1932 года ў г.Лунінцы Палескага ваяводства (цяпер Брэсцкай вобласці) у сям'і чыгуначнага рабочага. У 1941 годзе скончыў 3 класы гарадской школы № 1, паехаў у піянерскі лагер пад Ліду, які 22 чэрвеня разбамбілі нямецкія самалёты. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся дома з бацькамі. 8 ліпеня 1944 года (за два дні да вызвалення Лунінца Чырвонай арміяй) з бацькамі і 8-гадовай сястрой быў вывезены акупантамі на прымусовую працу ў Германію.

Пасля вайны Леў Коласаў скончыў чыгуначную школу, у 1953 годзе паступіў у Ленінградскі завочны індустрыяльны інстытут. У 1957 годзе пераехаў у Мінск, уладкаваўся працаваць на Камароўскую ЦЭЦ. З 1958 года працаваў на розных пасадах: ад лабаранта да вядучага інжынера лабараторыі, навуковага супрацоўніка цэнтральнага НДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў (да 2011 г.). За працоўную дзейнасць узнагароджаны знакам «Победитель социалистического

соревнования Министерства водного хозяйства СССР» (1977) і Ганаровай граматай ЦНДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў (2006).

Леў Коласаў ад бацькі пераняў захапленне паштовымі маркамі, ён вядомы ў Беларусі і за яе межамі філатэліст і гісторык пошты. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца яго выставачныя калекцыі: «Старыя пісьмы Беларусі», «Старонкі гісторыі Беларусі», «Палявая пошта 1941–1945 гг.». З 1969 года Л. Л. Коласаў займаў пасаду намесніка старшыні ГА «Беларускі саюз філатэлістаў», з 2000 па 2005 год — старшыні. Сапраўдны замежны член Польскай Філатэлістычнай Акадэміі (1995). Удастоены звання «Ганаровы філатэліст» (2011). Леў Коласаў — член-карэспандэнт Расійскай нацыянальнай філатэлістычнай акадэміі, ганаровы філатэліст БСФ.

Л. Л. Коласаў — аўтар шматлікіх публікацый па гісторыі пошты і філатэліі ў выданнях СССР, Беларусі, Расіі, Польшчы. Германіі. У газеце «Вечерний Минск» у 1967–1989 гадах вёў рубрыку «Клуб коллекционеров „Находка”». З 2002 года — член Беларускага саюза журналістаў. Сотні публікацый аўтара прысвечаны краязнаўству, рэгіянальнай гісторыі Беларусі, перш за ўсё роднай Лунінеччыне. Сярод іх цыклы артыкулаў пра Лунінец «пры Польшчы», у гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенныя дзесяцігоддзі, пра гісторыю вуліц, школ, храмаў, бібліятэк. Яшчэ адна важная для аўтара тэма — беларускія «остарбайтары» ў гады вайны.

Аўтар кніг «Почтовые дороги Белоруссии» (1982), «Филателия о Белоруссии» (1984), «Вымершие и умирающие профессии» (2003). У складзе раённай камісіі ствараў гісторыка-дакументальную хроніку «Памяць. Лунінецкі раён» (1995), стаў аўтарам мноства артыкулаў у гэтай кнізе. Быў адзначаны Ганаровымі граматамі Лунінецкага гаркама КПБ (1990) і Лунінецкага раённага Савета дэпутатаў (1995).

Л. Л. Коласаў удастоены каля 120 медалёў за калекцыі на філатэлістычных выставах у СССР, Расіі, Польшчы, Чэхаславакіі, Балгарыі, Кубе, Венгрыі, Даніі і іншых краінах.

Узнагароджаны знакам «Активист Всесоюзного общества филателистов» (1968), залатым знакам Польскага саюза філатэлістаў (1975), ганаровымі граматамі філатэлістычных таварystваў: Усесаюзнага (1972, 1973, 1976, 1977, 1985, 1989), Беларускага (1968, 1970) і інш. За прапаганду філатэліі ў друку адзначаны Ганаровай граматай ЦК УКЛСМ (1971), памятным медалём УТФ (1986), знакамі «100 гадоў польскай філатэліі» (1993) і «За заслугі перад польскай філатэліяй» (1993). Сярод узнагарод Льва Леанідавіча юбілейныя медалі «50 лет Победы в Великой Отечественной войне» (1995), «60 лет Победы в Великой Отечественной войне» (2005), знак «За дапамогу і падтрымку» фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне» (2005).

Жонка, Тамара Яўгенаўна, кандыдат хімічных навук, працавала старшым навуковым супрацоўнікам у Інстытуце фізікі Акадэміі навук БССР. Сын, Ігар Львовіч Коласаў, кандыдат геалагічных навук, загадчык лабараторыі Беларускага НДІ геалогіі.

**Творы Л. Л. Коласава**


1. Вымершие и умирающие профессии / Лев Колосов. – Лунинец : [б. и.], 2003. – 100 с.
2. Филателия о Белоруссии/ Лев Колосов. – Минск : Полымя, 1984. – 110 с. : ил.
3. Почтовые дороги Белоруссии / Лев Колосов. – Минск : [б. и.], 1982. – 61 с. – (Биб-чка газеты «Голас Радзімы»).
4. Почта в Лунинце в сентябре 1939 – июне 1941 года / Лев Колосов // Лунінецкі сшытак. Лунінец, 2016. Спецвып. № 7. С. 2–9.
5. Отто Шмидт в филателии / Лев Колосов // Веснік сувязі. 2016. № 4. С. 62–64.
6. Барановичская почта. Символы времени и пространства / Лев Колосов // Веснік сувязі. 2015. № 5. С. 64–66.
7. Родная школа в сердце вечно… /Лев Колосов // Лунінецкія навіны. 2015. 5 жніўня. С. 4 ; 9 верасня. С. 4 ;

16 верасня. С. 4 ; 23 верасня. С. 4 ; 7 кастрычніка. С. 3 ; 14 кастрычніка. С. 4 ; 21 кастрычніка. С. 4.

8. Почтовая летопись со многими неизвестными : (из истории почтовой службы Слуцка) / Лев Колосов// Веснік сувязі. 2015. № 3 ; № 4. С. 60–62.
9. Улицы первой любви / Лев Колосов // Лунінецкія навіны. 2014. 13 жніўня. С. 5 ; 15 жніўня. С. 5 ; 20 жніўня. С. 4 ; 27 жніўня. С. 4 ; 3 верасня. С. 4.
10. Письма войны / Лев Колосов // Нёман. 2014. № 7. С. 182–186.
11. Ваши права, «шоффёр»! / Лев Колосов // Лунінецкія навіны. 2014. 4 красавіка. С. 9 ; 9 красавіка. С. 4 ; 11 красавіка. С. 7 ; 16 красавіка. С. 4.
12. Почта на колесах : железнодорожная почта в белорусских губерниях в конце XIX – начале XX в./Лев Колосов //Веснік сувязі. 2013. № 4.
13. Якуб Колас в филателии / Лев Колосов // Нёман. 2012. № 11.
С. 221–222.
14. История почты в Шклове / Лев Колосов // Веснік сувязі. 2012. № 4. С. 57–60.
15. Почта в Лунинце : послевоенный период : (к125-летию Лунинецкой почты: 7 июля1887–7 июля 2012) /Лев Колосов //Веснік сувязі. 2011. № 1.
16. Лунинетчина в 1921–35 годах: хроника жизни / Лев Колосов // Лунінецкі сшытак. Лунинец,2011. № 11. С.19–23.
17. Полевая почта на территории Беларуси в годы Первой мировой войны / Лев Колосов // Веснік сувязі. 2009. № 1; № 4. С. 58–63.
18. Белорусская почта в послевоенные годы / Лев Колосов // Веснік сувязі. 2008. № 3 ; № 4. С. 56–60 ; № 5 ; № 6. С. 63–66.
19. Почта Беларуси. 20-е/ Лев Колосов // Веснік сувязі. 2007 № 4. С. 61–67.

20. Лунинецкая сфрагистика / Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2007. 12 студзеня ; 26 студзеня ; 7 лютага ; 16 лютага ; 23 лютага.
21. Сухой в Лунинце нашёл счастье / Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2006. 6 студзеня ; 13 студзеня.
22. Лунинецкая сфрагистика/ Лев Колосов // Лунінецкі сшытак. Лунінец,2006. № 6. С.17–24.
23. Лунинец. Год 1929-й // Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2006. 9 чэрвеня ; 23 чэрвеня ; 28 чэрвеня ; 30 чэрвеня ; 7 ліпеня ; 11 ліпеня.
24. Из истории лунинецкого костёла / Лев Колосов // Лунінецкая памяць. Дадатак 1 / уклад. Т. Канапацкая. Мінск,2006. С. 101–113.
25. Телеграф в Лунинце / Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2005. 11 лістапада ; 2 снежня ; 9 снежня.
26. Новая эра Лунинецкой почты / Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2005. 7 кастрычніка ; 14 кастрычніка ; 28 кастычніка.
27. Почта на Пинщине / Лев Колосов // Веснік сувязі. 2004. № 1. С. 65–73.
28. Новые сведения о древнем Бостыне / Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2004. 10 лістапада ; 12 лістапада.
29. Вся правда о войне/ Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2004. 18 чэрвеня ; 25 чэрвеня.
30. Новый год в середине прошлого века /Лев Колосов//Лунінецкія навіны. 2003. 11 студзеня ; 18 студзеня.
31. Царква ў Лунінцы» / Леў Коласаў // Лунінецкія навіны. 2002. 16 красавіка ; 18 красавіка ; 20 красавіка.
32. Сакрэтная папка «Е» нямецкага Генштаба / Леў Коласаў // Лунінецкія навіны. 2000. 20 чэрвеня ; 22 чэрвеня ; 27 чэрвеня.

33. Увасабленне высакароднасці/ Леў Коласаў// Лунінецкія навіны. 1999. 11 лютага ; 16 лютага.
34. Лунінец. Верасень 1939-га / Леў Коласаў// Лунінецкія навіны. 1999. 14 верасня ; 16 верасня ; 21 верасня ; 23 верасня.
35. Беларускія остарбайтэры / Леў Коласаў // Лунінецкія навіны. 1998. 9 красавіка.
36. Лунінецкай пошце – 110 гадоў /Леў Коласаў // Голас Радзімы. 1997. 17 ліпеня (№ 29).
37. Меліярацыя ў пачатку XX стагоддзя не атрымалася / Леў Коласаў // Лунінецкія навіны. 1996. 28 сакавіка ; 30 сакавіка ; 2 красавіка.
38. Лунінеччына на старажытных картах / Леў Коласаў // Памяць. Лунінецкі раён : гіст.-дакум. хроніка / уклад. Т. Канапацкая. Мінск, 1995. С. 50–51.
39. Лунінецкая пошта ў гады першай сусветнай вайны / Леў Коласаў // Памяць. Лунінецкі раён : гіст.-дакум. хроніка / уклад. Т. Канапацкая. Мінск, 1995. С. 212–214.
40. Жыў тут народ белакуры…/ Леў Коласаў // Голас Радзімы. 1995. 21 снежня (№ 51) ; 28 снежня (№ 52).
41. Грычын ; Прыпяць, Бобрык, Цна/ Леў Коласаў // Памяць. Лунінецкі раён : гіст.-дакум. хроніка / уклад. Т. Канапацкая. Мінск, 1995. С. 108–114.
42. Невядомы манастыр / Леў Коласаў // Лунінецкія навіны. 1992. 11 студзеня ; 18 студзеня ; 23 студзеня ; 1 лютага ; 8 лютага ; 15 лютага ; 22 лютага.
43. Остановись, мгновенье!: Послевоенный Лунинец в фотоснимках/ Лев Колосов. – Лунинец, 2018.
44. Исторические планы города Лунинца/ Лев Колосов. – Лунинец, 2019.
45. Тайны старых писем/ Лев Колосов, Карстен Альслебен. – Лунинец, 2020.
46. Из Беларуси писали в Палестину/ Лев Колосов// Лунінецкія навіны. – 2018. - №24.

47. Записки о кино в Лунинце/ Лев Колосов/ Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны-3. 2020. С.30-38
48. Прынясі малаток! / Леў Коласаў; пераклад з рускай мовы Алены Мальчэўскай// Полымя. 2019. №7. С.124-143; №8. С.134 – 152.
49. “Авангард” / Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2019. №90. С.6; №91. С.6; №92. С.7.
50. Принеси молоток/ Лев Колосов// Лунінецкія навіны. 2020. №16. С.6; №18. С.6; №19. С.5; №20. С.4; №23. С.6; №24. С.6; № 25. С.5; № 26. С.7; № 28. С.7; № 30. С.4; № 31. С.6; № 33. С.5; № 51. С.6; № 56. С.6; № 68. С.6; № 69. С.4; № 71. С.5; № 74.С5.
51. Тайна старых писем/ Лев Колосов // Лунінецкія навіны. 2019. 13 лістапада. С.7.
52. У небе самалёты СУ / Леў Коласаў // Лунінецкія навіны. – 2020. С.6.

## Аб жыцці і творчасці Л. Л. Коласава

1. Жилко, В. Новые имена для «Літаратурнай карты Берасцейшчыны»: [биографии известных литераторов — уроженцев Лунинецкого района; в т. ч. Л. Л. Колосов] //На научных форумах: сб. докладов / Вадим Жилко, Василий Тумилович; сост. В. Жилко. Лунинец, 2016. С. 19–25.
2. Колосов, Л. Живут в сердце родители / Лев Колосов, Ольга Гаврилова // Лунінецкая памяць. Дадатак 5. Кнігі і лёсы / уклад. Т. Канапацкая. Мінск, 2013. С. 129–139.
3. Акупацыя: [дакум. проза, расповед пра пачатак вайны і тры гады жыцця ў захопленым фашыстамі Лунінцы] / Леў Коласаў ; [уступ. Алены Мальчэўскай] // Полымя. 2015. № 5. С. 98–113 ; № 6.С. 119–133.
4. Увлечение отца / Лев Колосов // Лунинецкая памяць. Дадатак 2 / уклад. Т. Канапацкая. Мінск, 2007. С. 117–120.

5. Матвиенко, А. Информационное пространство не терпит пустоты : [о литературных произведениях и разнообразных публикациях в периодических изданиях о Великой Отечественной войне; в т. ч. о Льве Колосове] / Анатолий Матвиенко // Нёман. 2016. № 8. С. 214–216.
6. Серадзюк, Д. Леў Коласаў: «Філатэлія — гэта і вывучэнне гісторыі пошты краін» / Дзіяна Серадзюк ; фота Надзеі Бужан // Звязда. 2016. 13 лютага (№ 28). С. 5.
7. Мальчевская, Е. О чем нельзя спрашивать у филателистов?: / Елена Мальчевская // Нёман. 2012. № 10. С. 222–223.
8. Улитенок, Г.«Ты лети в родимый край, там увидишь светлый рай»: [о почтовых раритетах Первой мировой войны рассказывает Л. Л. Колосов] / Галина Улитенок // Советская Белоруссия. 2012. 15 августа. С. 14.
9. С юбилеем, Лев Леонидович!: Льву Леонидовичу Колосову – 80! // Веснік сувязі. 2012. № 4. С. 65.
10. Улитенок, Г. «Спят курганы темные, горем опалённые…» : письма и песни неволи: [о Л. Л. Колосове, бывшем узнике фашистской Германии] / Галина Улитенок // Советская Белоруссия. 2009. 6 октября. С. 6–7.
11. Уліцёнак, Г. Калекцыянер / Галіна Уліцёнак // Беларусь. 2009. № 3. С. 42–43.
12. Жилко, В. За заслуги: [о международных и республиканских наградах белорусского филателиста и краеведа Л. Л. Колосова] / Вадим Жилко // Информ-прогулка. Лунинец, 2009. 20 августа (№ 33). С. 2.
13. Гринкевич, Т. Штемпеля без штампов / Татьяна Гринкевич // Советская Белоруссия. 2007. 29 августа. С. 6.
14. Шалькевич, И. Между молотом и наковальней / И. Шалькевич // Згода. 2005. 19–26 сакавіка. С. 12.
15. Канапацкая, М. Сапраўдны лунінчанін : / М. Канапацкая // Краязнаўчая газета. 2005. Чэрвень (№ 23). С. 5.

16. Яночкин, С. Памяти Льва Колосова/ Святослав Яночкин/ Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны-4. 2021. С.18-20.
17. Жилко, В. Пройдём по нашим улицам/ Вадим Жилко/ Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны-2. 2019. С.45-48.
18. Канапацкая, Т. Радзіма пачынаецца з Лунінца / Таццяна Канапацкая// Милая малая родина, вечная наша любовь…/ ред.Т.П. Войтеховская. – Минск, 2019. С.174-179.
19. Жылко, В. Багацці Коласава/ Вадзім Жылко // Краязнаўчая газета. 2021. №24. С.3.
20. Дымаў, В. Вечарыны памяцi /Віталь Дымаў// Краязнаўчая газета. 2021. №25. С.6.
21. Жилко, В. Почётный гражданин / Вадим Жилко // Информ-прогулка. 2021. №17. С.8.
22. Жилко, В. Награды и достижения / Вадим Жилко // Информ-прогулка. 2019. № 6. С.6.
23. Жилко, В. Награды и достижения / Вадим Жилко // Информ-прогулка. 2019. №29. С.3.

# ЮБІЛЕЙНЫ ПАРТРЭТ 2022

**Методыка-бібліяграфічнае выданне падрыхтавана
аддзелам бібліятэчнага маркетынгу
Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі**

**Складальнік Л.Плаўсюк
Рэдакцыя і камп’ютарная вёрстка Т.Карпуковіч**